Вандроўка па горадзе

# Які след пакінула Бона Сфорца, хто быў першы бібліятэкар і куды зніклі помнікі Сталіну

## Усё гэта ў новых маршрутах, якія распрацавалі ў Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Яўхіма Карскага

**Аказваецца, менавіта ў Гродне ўпершыню пачалі брукаваць вуліцы, тут з'явіўся першы ў Беларусі водаправод і знаходзіцца самы старажытны гадзіннікавы механізм у Еўропе. Супрацоўнік аддзела краязнаўства, атэставаны экскурсавод, падчас вандроўкі знаёміць гродзенцаў з цікавымі фактамі з гісторыі абласнога цэнтра. Усе аглядныя лекцыі аб'яднаныя агульнай назвай — «Падарожжа па горадзе». Карэспандэнт «Звязды» таксама далучылася да групы і даведалася аб незвычайным мінулым сучасных вуліц і тых знакамітых асобах, якія пакінулі тут свой след.**



### Імем нязломнага генерала

Мы пачынаем наш рух з вуліцы Карбышава. Адпраўны пункт — будынак абласной бібліятэкі. Дарэчы, адзін з маршрутаў распрацаваны і па самой установе. Будынак належаў польскаму банку і быў першым шматпавярховікам горада ў 30-я гады мінулага стагоддзя. З тых часоў тут захаваліся шыкоўныя лямпы і сейфавыя дзверы.

**Супрацоўнік бібліятэкі Іна МІЦКЕВІЧ** пачынае аповед пра вуліцу, якая сёння носіць імя славутага генерал-лейтэнанта і ваеннага інжынера-фартыфікатара Дзмітрыя Карбышава. Вайна застала яго ў Гродне, ён прыязджаў сюды інспектаваць будаўніцтва 68-га ўмацаванага гродзенскага раёна — так званай лініі Молатава. Пры спробе выйсці з акружэння быў цяжка кантужаны ў баі і ў непрытомным стане захоплены ў палон.

Немцы імкнуліся перацягнуць яго на свой бок, ад адміністрацыі лагераў ён атрымліваў прапановы супрацоўнічаць, яго імкнуліся ачарніць, але ён быў нязломны, загінуў зімой 1945 года падчас катавання халоднай вадой на марозе. Дзмітрыя Карбышава называюць «ледзяным генералам», яго імем вуліцу назвалі ў сярэдзіне 1960-х гадоў.

Назва вуліцы часта мянялася з-за змены ўлады. Падчас Першай сусветнай вайны горад амаль пяць гадоў знаходзіўся пад уладай кайзераўскай Германіі, тады яна была Hohensteiner Str., пасля Другой сусветнай вайны — вуліца Камінтэрна. А яшчэ раней, у XIX стагоддзі, называлася Падвальнай, таму што знаходзілася пад валамі — фартыфікацыйнымі збудаваннямі. Тады гэта быў ускрай горада, цяпер — гістарычны цэнтр.

### Чым не падабалася Іванаўская?

Такая вуліца знаходзіцца непадалёк і сёння носіць імя нямецкага камуніста 30-х гадоў мінулага стагоддзя Эрнста Тэльмана. Але раней у яе таксама было некалькі назваў. Напрыклад, з 20-х гадоў мінулага стагоддзя насіла імя прэзідэнта ЗША Герберта Гувера. З гэтым звязана пэўная гісторыя. Вось што расказала Іна Міцкевіч:

— Калі тут у 1920-я гады быў голад, польскія дзеці напісалі ліст у гуманітарную арганізацыю ЗША, дзе ў той час працаваў будучы прэзідэнт. Гувер адказаў, і ў краіну, і ў наш горад была выслана дапамога. Удзячныя гродзенцы вырашылі назваць яго імем вуліцу, якая да гэтага, між іншым, мела дрэнную славу.

Чым не падабалася гараджанам Іванаўская? Назву гэтую яна атрымала ў канцы XIX стагоддзя падчас уваходжання ў склад Расійскай імперыі і сярод гродзенцаў яшчэ называлася «вуліцай чырвоных ліхтароў». Тады ў горадзе было шмат ваенных, якія ўзводзілі ўмацаванні Гродзенскай крэпасці. На перыяд будаўніцтва колькасць ваенных будаўнікоў была нават большая, чым жыхароў горада, у сувязі з чым пачала расці колькасць дамоў распусты. Нумары здаваліся і ў гасцініцы «Раяль», якая знаходзілася побач. Будынак, дарэчы, захаваўся, у савецкія часы тут быў рэстаран, а нядаўна аб'ект выкупіў прыватны інвестар і вядзе там капітальны рамонт. Вуліца Тэльмана вядомая сёння тым, што тут знаходзіцца шмат праваахоўных устаноў.

### Арбат і Брадвей у адным флаконе

Праз колькі метраў выходзім на цэнтральную вуліцу горада — Савецкую. Гэта, што называецца, мясцовы Арбат, бо яна толькі для пешаходаў. Яшчэ яе можна назваць тутэйшым Брадвеем з-за вулічных музыкаў. Ва ўтульных дварыках часта праходзяць танцавальныя імпрэзы.

Першапачаткова вуліца была брукаваная. Ад Іны Міцкевіч даведваемся, што менавіта Гродна пачаў першы ў Беларусі брукаваць вуліцы. Гэта адбылося яшчэ ў XVI стагоддзі па загадзе каралевы Боны Сфорцы, жонкі караля Рэчы Паспалітай Сігізмунда, якая часта тут бывала. Напрыклад, у Мінску брук сталі класці толькі ў канцы XIX стагоддзя. Праўда, сёння на Савецкай ў Гродне ляжыць плітка вырабу 30-х гадоў мінулага стагоддзя, і рабілася яна тут, на заводзе каля Нёмана. Плітка клалася па дыяганалі, каб швы не разбівалі коламі.

Адметнасць гэтага месца — балконы, якія захаваліся на старых будынках. Раней іх было значна больш. Аказалася, што многія зніклі пры рэканструкцыі. Некаторыя потым знаходзілі на сучасных катэджах. Кошт такога балкона — ад некалькіх тысяч долараў. На адным з падобных старых балконаў кожны аўторак увечары праходзіць невялікі канцэрт артыстаў абласной філармоніі.

У цэнтры вуліцы — звычайная на від цырульня. Яна вядомая тым, што тут пастаянным кліентам быў Васіль Быкаў, які жыў у Гродне амаль 30 гадоў. Праўда, цяпер цырульня зачыненая. А нядаўна ў дварыку вуліцы Савецкай з'явілася пано, дзе вядомы пісьменнік стаіць у гарадскім асяроддзі з кнігай у руках.

Бадай што, адзіны на ўсю вуліцу помнік прысвечаны маршалу Васілю Сакалоўскаму, Герою Савецкага Саюза, ураджэнцу Гродзеншчыны. Гэта знакавая мясціна часта з'яўляецца арыенцірам для сустрэч, а да вайны тут стаяў помнік Сталіну ў горадзе, дарэчы, іх было восем помнікаў. Пасля 1950-х гадоў іх ліквідавалі. Як казаў адзін пажылы гродзенец, раней для гэтага не было спецыяльнай тэхнікі, таму, помнік Сталіну, што стаяў на Савецкай, магчыма, проста закапалі побач. Факт не пацверджаны, але ніхто і не правяраў.

У канцы вуліцы, якраз перад плошчай Савецкай, не так даўно ўстаноўлены помнік святому Губерту — ахоўніку горада. Цікава, што на гербе горада Гродна — выява не самога святога, а аленя з крыжом паміж рагамі, які сустрэўся Губерту на паляванні.

### Публічная бібліятэка ў... манастыры

Як прадстаўнік бібліятэчнай справы Іна Міцкевіч не можа не спыніцца каля былога дамініканскага манастыра — самага доўгага будынка на вуліцы Савецкай. Праўда, цяпер аб манастырскім укладзе тут нічога не нагадвае, але гісторыя кажа аб тым, што ордэн дамініканцаў займаўся ў горадзе адукацыйнай дзейнасцю. Гэта была элітная ўстанова з вельмі багатай бібліятэкай, лабараторыяй, абсерваторыяй. Напэўна, тут і знаходзілася памяшканне для грамадскай бібліятэкі, бо першым яе бібліятэкарам быў манах-дамініканец, выкладчык дамініканскай гімназіі і павятовага вучылішча, прарэктар мужчынскай гімназіі Кандыд Зялёнка. Публічная бібліятэка была першая не толькі ў горадзе, але і на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Увогуле, гістарычны цэнтр вельмі добра захаваўся. Гродна — самы насычаны горад у Беларусі па колькасці помнікаў культуры і архітэктуры, а трыста гектараў старога цэнтра маюць міжнародны ахоўны статус.

Малюнак вуліц застаўся яшчэ з XV-XVI стагоддзяў, таму ў цэнтры ў асноўным аднабаковы рух і як вынік — аўтамабільныя заторы. Гэта даніна таму, што сучасныя аўто ездзяць па сярэдневечным горадзе.

Практычна на кожным будынку пасведчанне гісторыка-культурнай каштоўнасці. Хоць многія збудаванні пасля рэканструкцыі займелі сучасны выгляд, але сцены ці скляпы там могуць быць старажытныя.

### Што рабіў у Гродне Пётр I

Як толькі мы выйшлі на плошчу Савецкую, пачулі бой гадзінніка. Некалі ён быў на гарадской ратушы, а цяпер устаноўлены на Фарным касцёле. Наколькі гадзіннік старажытны, сведчыць дакумент 1540 года, дзе даецца загад на яго рамонт.

— Атрымліваецца, што ўжо тады ён не толькі працаваў, але і зламаўся, — распавядае наш гід. — Вось такі ўзрост механізма — самага старога ў Еўропе. Цяпер ён адлічвае час на вежы Кафедральнага сабора святога Францыска Ксаверыя. Праўда, тут новы цыферблат. Яго зрабілі ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Тады ж сталі спрабаваць завесці гадзіннік, які прастаяў амаль цэлае стагоддзе. І гэта атрымалася. Таму механізм не мянялі. За работай яго назірае захавальнік (такая пасада значыцца ў працоўнай кніжцы), які два разы на дзень падымаецца па 130 прыступках, каб выконваць сваю работу.

З'яўленне храма звязанае з прыходам у горад іезуітаў, якіх запрасіў Стафан Баторый, кароль Рэчы Паспалітай. Так ён укладваў інвестыцыі, кажучы па-сучаснаму, у адукацыю. Быў пабудаваны калегіум, дзе змаглі вучыцца бясплатна прадстаўнікі ўсіх саслоўяў. Касцёл мае тытул малой базілікі, у Беларусі толькі тры такія храмы (у Расіі — адзін), якія ніколі не зачыняліся і маюць найбольшую колькасць паломнікаў. На яго асвячэнні ў 1705 годзе прысутнічалі кароль Аўгуст II і расійскі цар Петр I.

Дарэчы, тут жа на плошчы ёсць і сучасны гадзіннік, праўда, сонечны. Ён знаходзіцца на месцы старажытнага рыначнага калодзежа.

### Усе дарогі вядуць у палац

Збочваем на вуліцу Замкавую. Яна прымыкае да Савецкай плошчы і вядзе да вытокаў Гродна — Замкавай гары, адкуль і пачаўся горад. Месца вельмі зручнае, на беразе Нёмана, схіл якога быў заслонай ад ворагаў. Тут князь Усеваладка ў XII стагоддзі і пачаў будаваць абарончы замак. У гэтым жа стагоддзі была ўзведзена Каложская царква, якая захавалася да нашых дзён, а вось замкі разбураліся і зноў будаваліся.

У Старым замку цяпер вядзецца маштабная рэканструкцыя, ён цалкам адновіцца і прыме выгляд прыгожага палаца часоў Стафана Баторыя. Менавіта ён зрабіў тут сваю рэзідэнцыю ў XVI стагоддзі, тут сустрэў свой апошні дзень. Ён хацеў быць пахаваным у Гродне, і некаторы час яго цела захоўвалася ў Фары Вітаўта, але потым труну вывезлі ў польскі Кракаў, дзе знаходзіцца пахавальня каралёў і знакамітых асоб. Але дагэтуль ходзіць паданне, што сэрца Стафана Баторыя засталося тут, у яго любімым Гродне.

Насупраць Старога замка знаходзіцца Новы. Знешне ён не такі велічны, але цікавы сваёй гісторыяй. Менавіта тут прайшоў знакаміты Маўклівы сейм 1793 года, які завяршыў Другі падзел Рэчы Паспалітай, калі значная тэрыторыя адышла Расійскай імперыі і Прусіі.

### Знаёмства на... развітанне

Шпацыр атрымаўся цікавы і пазнавальны. Гродзенцы Жанна і Сяргей прыйшлі ўпершыню, але плануюць здзейсніць вандроўку па яўрэйскім горадзе, маршрут распрацоўваецца ў аддзеле краязнаўства. Іх мэта — даведацца больш пра тыя вуліцы, якімі яны карыстаюцца, удакладніць некаторыя факты.

Прыцягнуў увагу турыст з веласіпедам. Аказалася, Уладзімір Грынёў прыехаў ажно з Новасібірска, каб пабываць разам з сынам на радзіме сваёй маці-беларускі. Яны наведалі Палессе, бліжэй пазнаёміліся са сваякамі, якіх бачылі толькі віртуальна. У канцы падарожжа падвярнуўся шанц зрабіць экскурсію па Гродне.

— Уражанне ад Беларусі вельмі пазітыўнае. Я рады, што напалову беларус. Гродна, асабліва ў цэнтры, адрозніваецца ад іншых гарадоў, мае свой шарм, — прызнаўся Уладзімір.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

---

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Карыснае выкарыстанне скошанай травы

**Многія косяць траву і пакідаюць скошанае проста там, куды яго адкінула газонакасілка, ці выкідваюць у смецце. Хоць ёсць шмат карысных спосабаў выкарыстання скошанай травы.**



### Дабаўка ў кампост

Скошаная трава, проста лежачы на зямлі, дапамагае ўгнаіць газон, але калі вы маеце намер выкарыстоўваць яе для градак, прыйдзецца сабраць і дадаць траву ў кампост.

Правільная кампоставая куча мае патрэбу як у зялёным, так і ў карычневым рэчыве, таму свежаскошаная трава запатрабуе трохі карычневага рэчыва, змяшанага з ёй. Добра спрацоўваюць сухія лісты і сухая трава. Калі вы дазволіце скошанай траве высахнуць, перш чым дадаць яе ў кампоставую кучу, не давядзецца думаць пра дадаванне якога-небудзь іншага карычневага або сухога матэрыялу.

### Вадкае ўгнаенне

Свежаскошаная трава ўтрымлівае шмат азоту і калію, што выдатна падыходзіць для вырабу ўгнаенняў або кампоставага чаю. Усё, што трэба зрабіць, гэта сабраць свежаскошаную траву, напоўніць ёю 20-літровую ёмістасць прыкладна на дзве траціны, дадаць ваду і пры перамешванні даць настаяцца на працягу трох дзён.



Вадкае ўгнаенне даволі хутка дзейнічае. Яно творыць цуды з перасаджанымі квітнеючымі або пладаноснымі раслінамі.

Але не захапляйцеся: дадавайце вадкае ўгнаенне толькі раз на два тыдні ці калі расліне неабходная невялікая падкормка. Занадта шмат угнаення можа нашкодзіць раслінам.

### Дом для чарвякоў

Свежаскошаная трава ўтрымлівае здаровую дозу азоту, які з'яўляецца добрай крыніцай ежы для чарвякоў. Зноў жа, не варта дадаваць занадта шмат. Проста перасыпце скошаную траву ў кошык.

Пры выкарыстанні скошанай травы для чарвякоў раскладзіце яе ў сонечным месцы, дайце высахнуць і стаць карычневай. Скошаная карычневая трава з'яўляецца выдатнай крыніцай вугляроду для глебы, дзе жывуць чарвякі.

### Падсцілка

Скошаная трава з'яўляецца добрай падсцілкай для большасці дамашніх жывёл.

Яна вельмі падабаецца трусам, таму што яны могуць закусваць ёю і спаць на ёй амаль адначасова. Добра высушыце траву і замяніце ёю старую травяную падсцілку, якую, у сваю чаргу, можна адправіць у кампоставую кучу.

Таксама скошаную сухую траву можна выкарыстоўваць як падсцілку для сабакі. У больш прахалодныя месяцы вазьміце сухую траву і зрабіце маленькую нару або гняздо ў сабачай будцы, каб той спаў, — і яму гэта спадабаецца.

### Корм для жывёл

Свежая і сухая скошаная трава — выдатны корм для трусоў (хоць гэта не адзіная ежа, якую яны ядуць). Козы таксама могуць не адмовіцца. Але важна пераканацца, што ў траве, якую вы збіраецеся выкарыстоўваць для корму, няма шкодных раслін або хімічных рэчываў.

### Натуральны фарбавальнік

Травяныя плямы вельмі цяжка выдаліць з адзення або нейкага матэрыялу, што значыць — скошаная трава можа быць добрым натуральным зялёным фарбавальнікам. Адпаведна, можна выкарыстоўваць свежаскошаную траву, каб фарбаваць тканіны! Звычайна ў выніку атрымліваецца жоўта-зялёны колер. Каб стварыць натуральны фарбавальнік, трэба сабраць свежаскошаную траву, пакласці яе ў каструлю, дадаць вады (прыкладна ў два разы больш), давесці да кіпення, паварыць на слабым агні гадзіну і настаяць.

Тканіну, якую вы хочаце пафарбаваць, пакладзіце проста ў ёмістасць з травой.

Калі патрэбнае больш цёмнае адценне, пакіньце тканіну замочанай нанач.

### Мульча

З травы атрымліваецца неверагодная якасная мульча, як для кветкавых, так і для агароднінных культур. Травяная мульча можа ахалоджваць каранёвую сістэму, затрымліваць вільгаць падчас засушлівага перыяду, спрыяць памяншэнню колькасці пустазелля і забяспечваць культурныя расліны неабходнымі пажыўнымі рэчывамі.

Пры выкарыстанні свежаскошанай травы неабходна вылажыць пласт таўшчынёй у 1 см вакол раслін. Гэта дазваляе траве раскладацца хутчэй і пазбегнуць празмернай вільготнасці для каранёў раслін. Лішак вільгаці можа выклікаць гніласць і цвіль. Сухую скошаную траву можна пакласці і таўсцейшым пластом.

### Засцярога ад пустазелля

Нашы бабулі і дзядулі часта карысталіся такім трукам. Яны размяркоўвалі ўсю скошаную траву па ўчастках, дзе не хацелі, каб з'ўлялася якое-небудзь пустазелле або новая трава, таму што ў іх былі планы на гэты ўчастак у наступным сезоне.

Затым можна сабраць гэтую траву і дадаць яе ў кампоставую кучу.

---

## Даты Падзеі Людзі

**14 ЛІПЕНЯ**

У краіне

**1891** год — нарадзіўся (в. Рудабелка, цяпер — пасёлак Акцябрскі) Лявонцій Яфімавіч Адзінцоў, удзельнік барацьбы за савецкую ўладу ў Беларусі, адзін з арганізатараў Мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1924 года — намеснік наркама сацыяльнага забеспячэння БССР, у 1931—1937-м — старшыня Беларускага інваліднага кааператыўнага аб'яднання, старшыня ЦК сялянскай грамадскай узаемадапамогі, загадчык Сакратарыята ЦВК БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у стварэнні і дзейнасці Мінскага патрыятычнага падполля. На яго кватэры праводзіліся пасяджэнні Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б, нарады падпольшчыкаў, захоўваліся зброя, боепрыпасы, нелегальная літаратура, медыкаменты. Загінуў у 1942 годзе.

**1911** год — нарадзіўся (вёска Стары Дзедзін, цяпер — Клімавіцкі раён) Павел Іванавіч Пруднікаў, беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. Працаваў у перыядычных выданнях, на радыё. У 1937 годзе рэпрэсіраваны, адпраўлены ў высылку. Рэабілітаваны ў 1956-м. Настаўнічаў. Аўтар зборнікаў паэзіі «Час майго нараджэння», «Познія ягады», «Прысады», паэмы «Таймыр», аповесцяў «Яжовыя рукавіцы» і «Пекла». Выступаў як публіцыст.

**1941** год — у баях пад Оршай прагрымеў першы залп батарэі рэактыўнай артылерыі — легендарных «кацюш». Капітан Іван Андрэевіч Флёраў аддаў загад адкрыць агонь у напрамку Аршанскага чыгуначнага вузла па групе вагонаў з тэхнікай, боепрыпасамі і жывой сілай праціўніка. «Бой» доўжыўся восем секундаў, але гэтага хапіла, каб чыгуначная станцыя з нямецкімі эшалонамі была цалкам ахоплена полымем. Сіла выбуху пераварочвала нават паравозы, а 10-тонныя нямецкія танкі кідала, нібы цацачныя кубікі. У той жа дзень батарэя накіравала агонь і на пераправу нямецка-фашысцкіх войскаў праз раку Аршыцу, знішчыўшы сотні гітлераўцаў, танкі, аўтамашыны ворага разам з пераправай. Крыху пазней батарэя Флёрава трапіла ў засаду. Практычна ўвесь асабовы склад на чале з камандзірам загінуў, абараняючы сакрэтную рэактыўную ўстаноўку. Сама «кацюша» была падарваная.

У свеце

**1099** год — крыжаносцы на чале з Готфрыдам Бульёнскім падчас I крыжовага паходу пачалі штурм Іерусаліма, які паў на наступны дзень. Пасля захопу Іерусаліма Готфрыд быў абвешчаны кіраўніком Іерусалімскага каралеўства, але замест каралеўскага тытула прыняў тытул барона і «Абаронцы Труны Гасподняй» (Advocatus Sancti Sepulchri).

**1789** год — парыжскімі паўстанцамі ўзята крэпасць Бастылія. Гэта стала пачаткам Вялікай французскай рэвалюцыі.



**1933** год — пачалася Арктычная экспедыцыя на параходзе «Чалюскін», якую ўзначальваў ураджэнец Беларусі О. Ю. Шміт.

Так гаварыў...

**УІЛЬЯМ ПЕН:**
*«Чалавек, які не можа кіраваць сабой, непрыдатны для кіравання іншымі».*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.56 | 21.34 | 16.38 |
| Віцебск — | 4.38 | 21.31 | 16.53 |
| Магілёў — | 4.46 | 21.25 | 16.39 |
| Гомель — | 4.51 | 21.13 | 16.22 |
| Гродна — | 5.13 | 21.48 | 16.35 |
| Брэст — | 5.22 | 21.40 | 16.18 |

### Месяц

*Апошняя квадра 2 ліпеня. Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

***Пр.*** *Соф'і, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Георгія, Германа, Дзяніса, Фёдара.*
***К.*** *Дамінікі, Люцыі, Тэрэзы, Эдварда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Муж кажа жонцы:**
**— Калі наступны раз будзеш казаць, колькі табе гадоў, памятай, што паміж табой і старэйшым сынам павінна быць розніца ў дзевяць месяцаў.**

У рэстаране. Афіцыянт:
— Месье, што будзеце есці.
— Я хацеў бы тое, што есць вунь той мужчына каля акна!
— Гэта немагчыма, ён не аддасць.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1882.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 ліпеня 2021 года.